4. Юрикова, С.А. Перспективы человечества в условиях техногенной цивилизации / С.А. Юрикова // Антропологічні виміри філософських досліджень. 2013. № 3. С. 94–101.

УДК 94(476)

# ГРУНВАЛЬДСКАЯ БІТВА Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ БЕЛАРУСАЎ

М.Д. Шмігельскі – 95 э, 1 курс, АЭФ
Навуковы кіраўнік: ст. выкладчык С.В. Мяньчэня
*БДАТУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Грунвальдская бітва 15 ліпеня 1410 г. лічыцца адной з буйнейшых бітваў Сярэднявечча, яна стала лёсавызначальнай для народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы – змяніла геапалітычны расклад сіл і адзначыла канец крыжацкай экспансіі на славянскія і балтыйскія землі.

Як і іншыя значныя гістарычныя падзеі, Грунвальдская бітва акружана шэрагам гістарычных міфаў, якія сфарміраваліся пад уплывам розных палітычных і культурных працэсаў [1]. Тэма Грунвальда прысутнічае ў дзяржаўнай палітыцы і ідэалогіі Польшчы і Літвы, як важная падзея ў працэсе ўмацавання дзяржаўнасці, урачыстасці звязаныя з гадавінамі бітвы тут адзначаюцца на дзяржаўным узроўні.

Для беларусаў Грунвальдская бітва доўгі час заставалася “чужой”, бо ў савецкай гістарычнай навуцы адмаўлялася роля беларускіх зямель у стварэнні Вялікага княства Літоўскага, якое называлі “дзяржавай літоўскіх феадалаў”, дзе беларусы знаходзіліся ў прыгнечаным стане. У школьных падручніках Грунвальдскай бітве адводзілася менш месца чым удзелу палачан у складзе войска Аляксандра Неўскага у бітве на Няве (1240 г.). У гістарычнай навуцы Грунвальдская бітва ўключалася ў канцэпцыю славянска-германскага супрацьстаяння і такім чынам звязвалася з падзеямі Другой сусветнай вайны. У масавай свядомасці Грунвальд асацыіраваўся з раманам польскага пісьменніка Генрыха Сянкевіча “Крыжакі” (1900 г.) і аднайменным польскім мастацкім фільмам, знятым да 550-годдзя бітвы ў 1960 г. Тут адлюстроўваецца польскі погляд: рашаючы ўклад польскіх войскаў, якія фактычна самастойна вырашылі зыход бітвы, ва ўмовах уцёкаў войскаў ВКЛ, факт якіх сучасная гістарычная навука не падцвярджае [2].

Сітуацыя змянілася з распадам савецкай палітычнай сістэмы, што суправаджавалася павышэннем цікаўнасці беларусаў да гістарычнага мінулага, у тым ліку перыяда сярэднявечча. Адбываўся гэты працэс ва ўмовах стварэння рамантычнага, ідэалізаванага вобраза мінулага, што спрыяла фарміраванню новых міфаў. Важную ролю ў гэтым адыграў раман К. Тарасава “Пагоня на Грунвальд” (1991 г.), дзе разам з больш

рэалістычнай карцінай бітвы прысутнічаў тэзіс аб тым, што пасля Грунвальда "звыш 500 год на тэрыторыю Беларусі на ступала нага ўзброенага немца" [3].

У выяўленчым мастацтве Беларусі вобразы Грунвальду стварылі мастакі Гаўрыла Вашчанка ("Бітва пад Грунвальдам"), Пётр Драчоў ("Спынім забойства"), Міхаіл Басалыга ("Грунвальдская бітва"), Фелікс Янушкевіч ("Урокі Грунвальду") [2].

Навуковае асэнсаванне Грунвальскай бітвы ў беларускай гістарычнай навуцы належыць Юрыю Бохану, Руслану Гагуа і Генаддзю Сагановічу. Беларускія навукоўцы вызначылі структуру войска ВКЛ, асаблівасці яго ўзбраення, з дапамогай разнастайных гістарычных крыніц развянчалі некаторыя міфы вакол бітвы [1; 2; 4].

Прысутнічае Грунвальд і ў гарадской тапаніміцы Беларусі. Вуліцы Грунвальдскія з'явіліся ў Брэсце, Ваўкавыску, Гродна, Лідзе, Магілёве і Полацку. У Мінску ў гонар славутай бітвы названы рэстаран на вуліцы Карла Маркса.

У 2010 г. у Гродна нападалёк ад Каложскай царквы, адкуль па легендзе выправілася на бітву армія вялікага князя Вітаўта з'явіўся памятны знак "Пагоня на Грунвальд". 17 ліпеня 2011 г. памятны знак, прысвечаны 600-годдзю бітвы быў усталяваны у Ваўкавыску.

Важную ролю адыграў Грунвальд у папулярызацыі сярэднявечнай культуры і станаўленні руху ваенна-гістарычнай рэканструкцыі. У пачатку 1990-х гг. быў арганізаваны летні лагер "Грунвальд", дзе дзеці вывучалі гісторыю, танцы, займаліся фехтаваннем, дзецьмі была зроблена рэканструкцыя Грунвальдзкай бітвы на драўляных мячах, у кардонных кірасах і шлемах з пап'е машэ, а ўжо ў 1995 г. у Мінску прайшоў першы сапраўдны фестываль сярэднявечнай культуры. Сёння рух ваенна-гістарычнай рэканструкцыі Беларусі налічвае больш 50 клубаў, якія аб'ядноўваюць некалькі тысяч чалавек. У 1998 г. беларускія рэканструктары ўпершыню прынялі удзел у міжнародным фестывалі "Грунвальд" у Польшчы, які праходзіць непасрэдна на месцы бітвы. Найбольш маштабныя ўрачыстасці адбыліся тут у 2010 г. З нагоды 600-годдзя бітвы сюды з'ехаліся ўрадавыя дэлегацыі амаль усіх еўрапейскіх краін і каля 300 тысяч гледачоў.

З 2008 г. у Музеі старадаўніх тэхналогій і рамёстваў "Дудуткі" праходзіць фестываль "Наш Грунвальд". Заяўленая мэта фестывалю – фармаваць і ўмацоўваць ўсвядомленае паважлівае стаўленне да гісторыі Беларусі, спрыяльна ўплываць на самасвядомасць і станаўленне патрыятычнага духу, захоўваць памяць аб легендарных старонках гісторыі Беларусі і традыцыях далёкіх продкаў. Колькасць удзельнікаў фэсту "Наш Грунвальд", па дадзеных арганізатараў, складае да 2019 г.

каля 500 чалавек, гледачоў – каля 8000 чалавек [5]. “Наш Грунвальд” на сёння з’яўляецца буйнейным мерапрыемствам падобнага роду ў Беларусі, аднак ён не ставіць сваёй мэтай падмяніць фестываль у Польшчы, бо нават па часе яны разведзены на два тыдні.

Такім чынам, Грунвальдская бітва, якая ўжо даволі даўно з’яўляецца часткай гістарычнай памяці палякаў і літоўцаў, заняла сваё месца і ў памяці беларусаў, што стала вынікам усведамлення гістарычнай спадчыны ВКЛ. І хоць бітва не так шырока вядома сярод людзей старэйшага пакалення, за гады незалежнасці Рэспублікі Беларусь былі зроблены важныя крокі па яе папулярызацыі.

### Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Сагановіч, Г. Грунвальд у беларускай гісторыі. Спроба разбору палітычнага міфа. – Мінск: Медысонт, 2015. – 416 с.

2. Гагуа Р.Б. Грюнвальд в источниках: «Хроника конфликта Владислава, короля Польши, с крестоносцами в год Христов 1410». – Пинск: ПолесГУ, 2009. – 208 с.

3. Тарасов, К. Погоня на Грюнвальд: Историческая повесть. – М.: Воениздат, 1986. – 272 с.

4. Бохан, Ю. Ваяры Грунвальдскай бітвы / Ю. Бохан. – Мінск : Беларусь, 2010. – 218, [4] с.

5. Міжнародны рыцарскі фестываль "Наш Грундвальд". Афіцыйны сайт. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: https://nashgrunwald.by. Дата доступа: 15.03.2021.

УДК 008(476)

## ФЕНОМЕН БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

В.А. Міхачова – 22 ім, 1 курс, ФПК

Навуковы кіраўнік: канд. гіст. навук, дацэнт Я.А. Грэбень

*БДАТУ, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Самая важная падзея для беларускай нацыі – стварэнне нацыянальнай дзяржавы. Але наяўнасць незалежнай краіны недастаткова, без нацыянальнай самасвядомасці, маркерам якой выступае родная мова. Актуальнасць працы тлумачыцца слабым выкарыстаннем беларусамі роднай мовы ў штодзённым жыцці. Мэта – высветліць прычыну такой сітуацыі, для чаго неабходна: прасачыць змены ў становішчы беларускай мовы ў гады беларусізацыі; ахарактарызаваць яе ролю ў станаўленні суверэнітэту Беларусі; прааналізаваць дадзеныя перапісу насельніцтва як маркера стану беларускай мовы.

Беларусізацыя, якая праводзілася ў 1920-я гг. ў БССР, – палітыка па пашырэнню ролі беларускай мовы ў грамадска-палітычным і культурным жыцці. Таксама пад беларусізацыяй разумеецца развіццё беларускай